# Ён трапіў у палон да Кліо даўно і назаўсёды

*Да 75-годдзя з дня нараджэння Анатоля Пятровіча Грыцкевіча*



На здымку (злева направа): мастак Уладзімір Вішнеўскі, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Грыцкевіч, старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп, старшыня Саюза мастакоў Беларусі Уладзімір Басалыга.










Шляхецкі род Грыцкевічаў вядомы на слуцкай зямлі з XVI стагоддзя. Яны добра гаспадарылі на сваіх землях, былі палітыкамі, шанавалі асвету і культуру, калі было патрэбна, бралі ў рукі зброю і разам з суседзямі бараніліся ад ворагаў. Тут, на Случчыне, нарадзіўся бацька Анатоля Пятровіча — Пётр Навумавіч. Настаўнік, удзельнік першай сусветнай вайны, ён падтрымаў рэвалюцыю, актыўна змагаўся ў шэрагах партызан супраць польскіх акупантаў, уступіў у рады бальшавікоў. Актыўнай прыхільніцай нацыянальнага Адраджэння была і маці — Агнеса Львоўна, медык, былая настаўніца з Рагачоўскага павета. У 1920 г. сям'я Грыцкевічаў пераехала ў Мінск, і тут 31 студзеня 1929 г. у Пятра Навумавіча і Агнесы Львоўны нарадзіўся сын Анатоль.

У юбілейных віншаваннях часта сустракаецца выраз: "Нішто не прадказвала...". У адносінах да Анатоля Пятровіча Грыцкевіча так не скажаш, таму што яму якраз і прадказвалася яскравая навуковая будучыня. Незвычайны выпадак адбыўся ў далёкім Фрунзе (Бішкеку) у гады вайны, калі 14-гадовы падлетак, тады яшчэ проста Толя, апынуўся ў эвакуацыі. Аднойчы, стоячы ў чарзе за хлебам, ён чытаў успаміны канцлера Бісмарка, на што звярнуў увагу адзін з суседзяў і сказаў: "Хлопчык, ты далёка пойдзеш". І гэтае прадказанне збылося. Маладога Анатоля Грыцкевіча цікавілі розныя навукі: гісторыя, медыцына, замежныя мовы. У 1950 г. ён скончыў Мінскі дзяржаўны медыцынскі інстытут, у 1955 г. — факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Але захапленне гістарычнай навукай перамагло іншыя інтарэсы Анатоля Пятровіча. У 1958 г. ён заканчвае гістарычны факультэт БДУ, становіцца малодшым навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР.

За 45 гадоў служэння музе гісторыі Кліо А.П.Грыцкевічам зроблена неверагодна многа. Актыўная навукова-даследчая праца акрэсліла асноўныя праблемы, якімі пачаў займацца Анатоль Пятровіч. Безумоўна, кірунак навуковых даследаванняў не заставаўся нязменным, тэматыка іх пастаянна пашыралася. Як навуковец, Анатоль Пятровіч пачынаў з вывучэння гісторыі Беларусі ў перыяд сярэдневякоўя. Ён даследуе развіццё мануфактур, рамёстваў, гандлю і г.д. Асабліва яго цікавіць сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўласніцкіх гарадоў Беларусі, і ў першую чаргу Случчыны, адкуль бяруць пачатак карані шляхецкага роду Грыцкевічаў. Хутчэй за ўсё па гэтай прычыне ён абраў тэмай кандыдацкай дысертацыі "Сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватна-ўлас-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ

ніцкага горада Беларусі ў XVI—XVIII стст. (на матэрыялах Слуцка)", якую абараніў у 1964 г. Прадметам аналізу ў доктарскай дысертацыі, абароненай у 1985 г., стала сацыяльна-эканамічнае развіццё прыватнаўласніцкіх гарадоў Вялікага княства Літоўскага.

Грунтоўныя даследаванні гісторыі эканамічнага развіцця і сацыяльных станаў насельніцтва Беларусі дазволілі Анатолю Пятровічу зрабіць і адстойваць вельмі важную навуковую выснову аб Вялікім княстве Літоўскім як беларуска-літоўскім гаспадарстве. Некалькі дзесяткаў артыкулаў ён прысвяціў генеалогіі беларускіх і літоўскіх магнацкіх і шляхецкіх родаў.

А.П.Грыцкевіч — галоўны рэдактар і аўтар шэрага артыкулаў першага і другога выпускаў зборніка "Славутыя імёны Бацькаўшчыны", выданне якіх ажыццявіў Беларускі фонд культуры ў 2001 і 2003 гг.

Апошнім часам А.П.Грыцкевіч актыўна працуе над вывучэннем гісторыі міжканфесіянальных адносін. Яго навуковы інтарэс ахоплівае працэсы, якія адбываліся ў праваслаўнай, каталіцкай і уніяцкай цэрквах, а таксама станаўленне пратэстантызму ў Беларусі. Вынікам гэтай працы стала публікацыя значнай колькасці артыкулаў і раздзела "Канфесіі на Беларусі" ў дапаможніку "Беларусазнаўства".

Яшчэ адной тэмай навуковых даследаванняў Анатоля Пятровіча з'яўляюцца падзеі часоў грамадзянскай вайны 1918—1920 гг. Можна не пагаджацца з яго высновамі, але дакументальныя факты, выкарыстаныя і прааналізаваныя аўтарам, нельга аспрэчыць. Неабходна асабліва падкрэсліць, што ўсе навуковыя працы А.Грыцкевіча маюць грунтоўную дакументальную аснову, а новыя метадалагічныя падыходы, якія ён прапануе, спрыяюць развіццю гістарычнай навукі. Яго навуковыя працы выдадзены на беларускай, рускай, польскай, літоўскай, англійскай мовах.

Актыўная навуковая дзейнасць не перашкаджае Анатолю Пятровічу займацца выкладчыцкай і адміністрацыйнай працай. З моманту заснавання Мінскага інстытута культуры (цяпер Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры) А.Грыцкевіч актыўна ўдзельнічае ў яго навуковым, педагагічным, грамадскім жыцці. Яго асабовая справа мае першы нумар, бо ён першым прыйшоў сюды на працу ў жніўні 1975 г., калі трэба было не толькі распачынаць заняткі, наладжваць работу кафедры гісторыі СССР, БССР і замежных краін, якую ён узначаліў, але і ачышчаць аўдыторыі ад будаўнічага друзу, заносіць сталы, вырашаць многія гаспадарчыя пытанні.

Амаль што 30 гадоў Анатоль Пятровіч кіруе кафедрай, якая пасля шматлікіх змен называецца кафедрай гісторыі Беларусі і музеязнаўства. У 1987 г. яму нададзена вучонае званне прафесара. Як загадчык кафедры, Анатоль Пятровіч арганізуе, кантралюе, асабіста ўдзельнічае ва ўсіх напрамках кафедральнай дзейнасці: у выкладанні гістарычных, музеязнаўчых дысцыплін, навукова-даследчай працы па гэтых галінах навукі; выхаваўчай рабоце са студэнтамі. Пад яго кіраўніцтвам працуюць не толькі калектыў кафедры, але і студэнты, якія навучаюцца па спецыяльнасці "музеязнаўства і ахова культурна-гістарычнай спадчыны". У адносінах да ўсіх у Анатоля Пятровіча хапае цярпення, далікатнасці, а вырашаць штодзённа даводзіцца шмат пытанняў — ад арганізацыі вучэбнага працэсу да асабістых праблем студэнтаў.

Сярод супрацоўнікаў універсітэта Анатоль Пятровіч карыстаецца вялікай павагай перш за ўсё за свае энцыклапедычныя веды, гатоўнасць заўсёды падзяліцца імі, тактоўнасць і яшчэ шляхетнасць, што вельмі падабаецца моладзі. Яго заняткі наведваюць з задавальненнем, запрашаюць выступіць з навукова-папулярнымі лекцыямі перад сябрамі студэнцкага краязнаўчага таварыства "Этна", часта просяць аб кансультацыях, таму што навуковы аўтарытэт Анатоля Пятровіча бясспрэчны. Ён чытае лекцыі па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі, спецкурсы па генеалогіі, гісторыі Расіі, Літвы, Украіны, Польшчы, прыватнаўласніцкіх гарадоў Беларусі XV—XVIII стст., канфесій у Беларусі і інш.

А.П.Грыцкевіч перадае свой багаты навуковы і метадычны вопыт аспірантам, саіскальнікам і дактарантам. Можна сказаць, што актыўна фарміруецца яго навуковая школа, бо за апошнія гады абаронены 2 доктарскія дысертацыі, навуковым кансультантам якіх з'яўляўся Анатоль Пятровіч, рыхтуецца да абароны некалькі кандыдацкіх. Прызнаннем яго навуковага аўтарытэту з'яўляюцца прапановы выступіць у якасці апанента па доктарскіх і кандыдацкіх дысертацыях, рэцэнзента і навуковага рэдактара манаграфій і падручнікаў, а таксама шматлікія запрашэнні на навуковыя канферэнцыі за мяжу.

Нягледзячы на напружаную навуковую, выкладчыцкую і арганізацыйна-метадычную працу, А.П.Грыцкевіч знаходзіць час, каб займацца грамадскай дзейнасцю. Яго імя вядома далёка за межамі Беларусі, што дазваляе Анатолю Пятровічу выкарыстоўваць свой аўтарытэт у кіраванні дзейнасцю Згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына", на пасадах прававадзейнага сябра Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі (Масква), гісторыка-радаводнага таварыства ў Маскве, Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сябра рэдакцыйнага савета "Беларускай Энцыклапедыі" і "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі", міжнароднай рэдкалегіі па выданні падручнікаў па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы і Украіны на замежных мовах (г. Люблін), члена рэдкалегіі многіх гістарычных часопісаў, у тым ліку і "Беларускага гістарычнага часопіса" з дня яго заснавання.

Нягледзячы на штодзённыя клопаты, А.П.Грыцкевіч працягвае актыўную навуковую дзейнасць. За апошнія пяць гадоў ён надрукаваў больш за сотню навуковых артыкулаў у часопісах і энцыклапедыях. Ён з'яўляецца аўтарам 6 манаграфій, 1 125 навуковых, навукова-папулярных і метадычных прац, сааўтарам дапаможніка "Беларусазнаўства".

Калектывы Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры, "Беларускага гістарычнага часопіса", сябры і калегі шчыра віншуюць Анатоля Пятровіча з юбілеем і жадаюць далейшых навуковых здзяйсненняў, сямейнага дабрабыту і радасці, заўсёды заставацца такім шляхетным і прынцыповым, далікатным і ўважлівым, сціплым і вясёлым. Здароўя і радасці Вам, паважаны Анатоль Пятровіч, на многія гады.

***Марыя Бяспалая,***
*доктар гістарычных навук, прафесар.*
***Аляксандр Смолік,***
*доктар культуралогіі, прафесар,*
***Васіль Кушнер,***
*галоўны рэдактар*
*"Беларускага гістарычнага часопіса".*



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ